# Узмацніць падрыхтоўку да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве

⊙

К. В. КІСЯЛЁЎ

Старшыня СНК БССР. Старшыня ўрадавай камісіі па правядзенню дэкады

⊙

Совет Народных Камісараў СССР дазволіў Соўнаркому БССР правесці дэкаду беларускага мастацтва ў Маскве. Для нас гэтае рашэнне мае каласальнае палітычнае значэнне. Яно дае магчымасць прадэманстраваць поспехі нашай рэспублікі ў галіне мастацтва ў Маскве перад прапоўнымі сталіцы, перад кіраўнікамі нашай партыі і ўрада, перад вялікім другам працоўных усяго свету роднымі Сталіным. Дэкада беларускага мастацтва адбудзецца ў маі бягучага года. Яна з'явіцца буйнейшай падзеяй у жыцці беларускага народа, яго вялікім і радасным святам.

Беларускі народ пад геніяльным кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, пры актыўнай брацкай дапамозе вялікага рускага народа, набыў сваю соцыялістычную дзяржаўнасць, стаў поўнапраўным гаспадаром свайго лёсу. У недалёкім мінулым, да кастрычніка 1917 года, а ў заходніх абласцях да верасня 1939 года, беларус не лічыўся чалавекам. Царскія сатрапы, польскія паны і памешчыкі называлі яго «палянцуком», «быдлам» і т. п. «пяшчотнымі» іменамі, жорстка эксплаатавалі і папіралі яго правы.

Партыя Леніна—Сталіна пабеданосна правяла наш народ праз гады гераічнай барацьбы з адкрытымі і скрытымі ворагамі, раскрыла велічныя перспектывы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Партыя праменнямі ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі асвятляе пабеданосны шлях да заможнага і культурнага жыцця. Убогая і забітая ў мінулым Беларусь ператварылася ў адну з квітнеючых совецкіх соцыялістычных рэспублік вялікага Саюза ССР. Няма больш адсталай, аграрнай, поўкаланіяльнай Беларусі з беднымі, вузкімі палоскамі сялянскіх зямель, з сахой-душагубкай, з каўтуном у валасах прававітага беларуса. Ёсць індустрыяльна-калгасная Совецкая Соцыялістычная Беларусь, пакрытая густой сеткай фабрык і заводаў, з магутнай, аснашчонай перадавой тэхнікай соцыялістычнай сельскай гаспадаркай, з шырокай сеткай вышэйшых, сярэдніх і пачатковых школ, з вялікай колькасцю мастацкіх і відовішчных устаноў і прадпрыемстваў.

Правядзенне дэкады беларускага мастацтва ў Маскве — падзея надзвычайнай палітычнай важнасці. У ёй знойдзе адлюстраванне веліч совецкага ладу, веліч ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. За гады совецкай улады БССР дасягнула сапраўды грандыёзных поспехаў ва ўсіх галінах гаспадаркі і культуры. У галіне соцыялістычнага мастацтва мы маем не толькі велізарны рост творчых устаноў (стварэнне Тэатра оперы і балета, філармоніі і іншых мастацкіх устаноў) але і, што асабліва трэба падкрэсліць, ідэйны і творчы рост нашых мастацкіх кадраў, нашых майстроў мастацтва. Дастаткова ўказаць на тую акалічнасць, што за апошнія гады за паспяховую работу па стварэнню мастацкіх каштоўнасцей урад БССР прысвоіў дзесяткам майстроў званне заслужаных і народных артыстаў, заслужаных дзеячоў мастацтваў і т. д. Наша краіна выхавала цудоўных артыстаў і мастакоў, кампазітараў і драматургаў, ствараючых выдатныя ўзоры мастацтва. Дасягненні ў галіне мастацтва мы павінны прадэманстраваць на дэкадзе, якая павінна з'явіцца магутным срodкам далейшага, яшчэ большага ўздыму ўсяго мастацтва рэспублікі.

Не гледзячы на тое, што падрыхтоўка да дэкады знаходзіцца ў поўным разгары, нашы поспехі ў гэтай галіне яшчэ недастатковы і не даюць ніякіх падстаў заўчасна сказаць, што да дэкады мы ўжо гатовы. Наадварот, кіраўнікі асобных калектываў, што ступць на дэкаду, работу яшчэ поўнасцю не разгарнулі. Падрыхтоўка ў рамках калектываў ідзе яшчэ надзвычай марудна, не тымі тэмпамі, якія нам патрэбны.

Узяць да прыкладу асноўны калектыў — Тэатр оперы і балета. Тут да нядаўняга часу марылі аб якойсьці «шырокай» дэкадзе, рыхтуючы пяць-шэсць спектакляў, а над рэпертуарам, зацверджаным урадавай камісіяй, па-баявому не працавалі. Не скончыўшы па-сапраўднаму работу над добрым балетам «Салавей», тэатр заняўся другім — балетам кампазітара Кабалеўскага. Ніхто не супярэчыць, каб тэатр рыхтаваў новы балет, але рэпертуар дэкады павінен быць падрыхтаван у першую чаргу. Мы гэтага патрабуем ад тэатра і будзем надалей патрабаваць.

Недзе вялікі размах работы ў тэатры і захапленне перзальнымі планамі прывялі да затрымкі выпуску ў новай рэдакцыі першай беларускай оперы «Міхась Пад-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы